Прывесьці ў баявую гатоўнасьць усе вагары барацьбы за сацыялістычны ўраджай!

Цана асобнага нумару 10 кап.

Пралетарыі ўсіх краў, злучайцеся!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

16-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

НЯДЗЕЛЯ
12 САКАВІКА 1933 г.
№ 56 (37 6)

Вышэй сьцяг пралетарскага інтэрнацыяналізму

У «Правде» ня раз друкаваліся матар'ялы, якія сьведчаць аб актывізацыі разгромленых і выбітых з эканамічнай калёны мясцовых буржуазна-кулацкіх нацыяналістскіх рэштак і аб грубейшых скажэньнях ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Заслугоўвае асаблівай увагі ліст ЦК КП(б)Б і СНК БССР («Правда» од 4 сакавіка) «Аб памылках партыйных і савецкіх арганізацый Беларусі ў нацыянальным пытаньні». У гэтым лісьце яны прызнаюць, што многія кіруючыя партыйныя і савецкія арганізацыі Беларусі «не вядуць бальшавіцкай барацьбы за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму і ў радзе выпадкаў патураюць буржуазна-кулацкім нацыяналістычным тэндэнцыям». І гэта ня гледзячы на неадназовыя ўказаньні і перасьцярогі з боку ЦК УсеКП(б).

Савецкі саюз самая шматнацыянальная краіна ў сьвеце і разам з тым самая «дасканалая арганізацыя супрацоўніцтва народаў» (Сталін).

Мы працоўнікі нацыянальнай вароженасьці, нацыянальнай рознасьці, нацыянальнай абасобленасьці.

Мы міжнароднікі... інтэрнацыяналісты...» гэты лёзунг Леніна напісала на сваім сьцягу наша партыя. Каст рычніцкая рэвалюцыя паставіла крыж на калёніязатарскай, русыфікатарскай палітыцы царскага ўраду і высунула на сцэну раней забытыя народнасьці, прабудзіла іх да новага жыцьця, да новага разьвіцьця на сацыялістычнай аснове. Пазнаёмцеся бліжэй з вынікамі першай пяцігодкі і вы зьдзівіцеся радыкальнай зьмене аблічча ўсіх народаў, аб'яднаных у Савецкі саюз. У нацыянальных рэспубліках і абласьцях краіны няўхільна мацнее савецкая дзяржаўнасьць. З кожным годам вырастаюць ачагі сацыялістычнай індустрыі, калектывізуецца сельская гаспадарка, ліквідуюцца фэадальна-байскія, кулацкія элементы, выкарчоўваюцца самыя глыбокія карэні эксплёатацыі. Павялічваецца сетка школ, газэт і тэатраў на мясцовых мовах. Растуць уласныя пралетарскія кадры, што яшчэ больш цэмэнтуе апору пралетарскай дыктатуры ў былых калёніях расійскай буржуазіі.

Дзяжуючы ленінскай нацыянальнай палітыцы, народы Савецкага саюзу—Татарыя, Башкірыя, Казакстан, Кіргізія, Дагестан і г. д. — здолелі перайсьці ад розных форм гаспадаркі і патрыярхальна-родавага быту непасрэдна да сацыялістычнага будаўніцтва, мінуючы капіталістычны шлях разьвіцьця.

Поўнасьцю забясьпечана магчымасьць свабоднага разьвіцьця і пасобным нацыянальным меншасьцям, якія падпадалі пры панаваньні капіталістаў і памешчыкаў нячуваным гнётам.

Які найвялікшы кантраст са становішчам шматмільённых мас працоўных Кітаю, Індыі, Марока, Алжыру, Конга, і г. д., якія знаходзяцца пад цяжкім прэсам уціску з боку імпэрыялістычных драпежнікаў Эўропы, Амэрыкі і ўласнай буржуазіі.

Уступленьне СССР у другую пяцігодку сацыялістычнага будаўніцтва азначае яшчэ большы гаспадарчы і культурны ўздым і росквіт нацыянальных рэспублік і абласьцей нашай вялікай краіны.

Трэба, аднак, мець на ўвазе, што ў нацыянальным пытаньні выключна шкодна пакладацца на самацёк. Посьпехі далейшага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі будуць тым больш значнымі, калі кожная партыйная арганізацыя, кожны камуніст глыбока ўсьвядомяць тое новае, што ёсьць зараз у клясавай барацьбе ўнутры краіны, калі яны з яшчэ большай пасьлядоўнасьцю і непрымірымасьцю будуць змагацца за лінію партыі ў нацыянальным пытаньні супроць усіх і ўсякіх ад яе адхіленьняў. Узмацненьне магутнасьці Савецкага саюзу сустракае заўзятае супраціўленьне разбітых контррэвалюцыйных, буржуазна - кулацкіх, нацыяналістычных груп, няўхільна ад рымліваючы свой адбітак і ўнутры партыі. Клясавы вораг і на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва пашырэньне ў адкрытых баёх, прабуе зараз іншымі спосабамі, іншымі сродкамі накіраваць супроць нас свае апошнія сілы, распачынаюць злосьць і нянавісьць. Ад мэтадаў непрыкрытай барацьбы ён перайшоў да мэтадаў барацьбы завуаляванай, не атрымліваючы ў радзе выпадкаў рашучага адпору з боку мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый. Гэтым, перш за ўсё, і тлумачыцца тое, што за апошні час у радзе раёнаў, у прыватнасьці, Беларусі, Украіны, а таксама Сярэдняй Азіі і Казакстану, далёка не адзіныя выпадкі пранікненьня шавіністаў на пасобныя вучасткі сацыялістычнага будаўніцтва, у асобныя звены савецкага і прафсаюзнага апарату, асабліва ў зямельныя органы і культурна-асьветныя установы, а таксама ў школы, ВНУ, і нават у рады партыі і камсамолу.

Гэтым у сваю чаргу тлумачыцца і тое, што ў радзе месц тых-жа рэспублік ажывіліся ўхілісты ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму і мясцовага нацыяналізму.

Супраць ухілу да вялікарускага шавінізму, як ня раз указваў т. Сталін, заключаецца перш за ўсё у імкненьні абысьці нацыянальныя рознасьці мовы, культуры, быту, разьвіваць палітыку партыі па нацыянальным апарату, прэсы, школы і іншых арганізацый і тым самым падарваць прынцып нацыянальнага рэспубліка і падрыхтаваць ліквідацыю нацыянальных рэспублік і абласьцей. Іменна ў гэтым кірунку і арудуюць зараз вялікарускія шавіністы і іх агенты ўнутры партыі.

«Правым» вялікадзяржаўным ухілістаў зьяўляецца капітулянцкай перад труднасьцямі нацыянальна-культурнага будаўніцтва і накіравана яна, таксама як і «тэорыя» аб аслабленьні клясавай барацьбы, аб «плаўным» ходзе разьвіцьця і аб адміраньні пралетарскай дзяржавы, да падрыву савецкай улады. Вялікадзяржаўны ўхіл зьяўляецца галоўнай небясьпекай у нацыянальным пытаньні нашай партыі, бо ён у сваю чаргу стварае спрыяючую глебу для распальваньня нацыяналістычных пачуцьцяў сярод мас і тым самым узмацняе пазыцыі мясцовых буржуазна-кулацкіх і байскіх элемэнтаў і іх суўдзельнікаў унутры партыі. У выніку гэтага часам ўхіл да мясцовага нацыяналізму набывае на пасобных вучастках і ў пасобных раёнах асаблівую надзённасьць. У гэтым мы ўпэўніваемся зараз на прыкладзе тэй-жа Беларусі, а таксама Украіны і ряду іншых нацыянальных рэспублік.

Як вядома — на гэта таксама ня раз указваў тав. Сталін — сутнасьць ухілу да мясцовага нацыяналізму заключаецца перш за ўсё ў імкненьні абасобіцца і замкнуцца ў рамках сваёй нацыянальнай шкарлупы, затушаваць клясавыя супярэчнасьці ўнутры сваёй нацыі, адыйсьці ад агульнага патоку сацыялістычнага будаўніцтва, ня бачыць таго, што обліжае і злучае працоўныя масы нацыянальнасьцей СССР і бачыць толькі тое, што можа іх аддаліць адну ад другой. Іменна ў гэтым кірунку і дзейнічае зараз ах восьце разгромленых буржуазна-кулацкіх, нацдэмаўскіх і пятлюраўскіх банд і іх агенты ўнутры партыі, часта карыстаючыся клясавай сьлепатой мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый. Невыпадкова таму, што ў радзе раёнаў Беларусі, Украіны, Сярэдняй Азіі і Казакстану контр-рэвалюцыйныя нацыяналістычныя элемэнты і іх агенты прабавалі скарыстаць усе сродкі, у тым ліку школьныя катэдры, старонкі мясцовых часопісяў падмоскі нацыянальных тэатраў для арганізацый контр-рэвалюцыйнага сабатажу мерапрыемстваў партыі і ўраду.

Побач з гэтым яны пры простым папушчэньні некаторых мясцовых партыйных і савецкіх работнікаў імкнуцца проціпастаўляць інтарэсы асобных рэспублік інтарэсам усёй краіны, усяляк ігнараваць нацыянальныя мовы і нават прасьледаваць за ўжываньне гэтых моваў. У Беларусі, напрыклад, аднаго настаўніка Сьцяпура толькі за тое, што ён гутарыў з жонкай дома на расійскай мове, ухілісты да мясцовага нацыяналізму, падаправаныя нацдэмамі, ашальмавалі і абазвалі ў вялікарускім шавінізьме. Ці патрэбен яшчэ больш яркі прыклад беззаконнасьці і грубейшага скажэньня ленінскай нацыянальнай палітыкі?

Кожны сумленны камуніст, кожны сьвядомы рабочы і калгасьнік дасканала ведаюць, што наша партыя і савецкая ўлада аказваюць усялякае пад трыманьне буржуазнай культуры, ставячы ў галаву вугла палітыку «зьліжэньня пралетараў і паўпралетараў розных нацыянальнасьцей для супольнай рэвалюцыйнай барацьбы...» (З праграмы УсеКП(б). Усякі іншы пункт гледжаньня зьяўляецца выгодным толькі нашым клясавым ворагам.

Ня можа быць сумненьня ў тым, што ўхілісты да мясцовага нацыяналізму, прыкрываючыся фальшываным нацыянальным сьцягам, па сутнасьці справы абараняюць у сучасны пэрыяд клясавай барацьбы і ліквідацыі кулацтва, апошнія пазыцыі разгромленых, выбітых з эканамічнай калёны буржуазна-кулацкіх, нацыяналістычных элемэнтаў, граючы на руку міжнародным імпэрыялістам, на руку антэрвэнтам. Контр - рэвалюцыйная дзейнасьць усякага роду шавіністаў і ўхілістаў у нацыянальным пытаньні палягчаецца, а ў радзе выпадкаў аказваецца магчымай, перш за ўсё, у выніку невыстарчальнай рэвалюцыйнай пільнасьці, а часамі і грубых памылак мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый. Сапраўды, хіба не аб гэтым сьведчыць нядаўна апублікаваныя ў «Правде» матар'ялы аб вылазках і дзеяньнях антысавецкіх эсэраўскіх, нацдэмаўскіх і бундаўскіх элемэнтаў у некаторых раёнах Беларусі і ў Сярэднай Азіі? Усе факты, вылажаныя ў гэтых матар'ялах, сьведчаць, што мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі не зразумелі новай тактыкі, новых манэўраў рэштак разьбітага кулацтва і аказаліся ў палоне ў мясцовых нацыяналістычных элемэнтаў і ўхілістаў да іх. І хіба, нарэшце, не аб гэтым-жа сьведчаць абурачыя факты прыбейшага скажэньня ленінскай нацыянальнай палітыкі на Украіне. І тут у радзе раёнаў у рэзультаце прытупленьня клясавай пільнасьці, неразуменьня новых манэўраў рэштак разьбітых клясаў, недаацэнкі непарыўнай сувязі нацыянальнага пытаньня з сялянскім, апрымалася значнае аслабленьне барацьбы супроць ухілаў у нацыянальным пытаньні. У некаторых раёнах нацыянальная палітыка партыі праводзілася мэханічна, бяз уліку канкрэтных асаблівасьцей, без неабходнай выхаваўчай работы і неабходнага кантролю, без аддаваньня належнай увагі справе падрыхтоўкі бальшавіцкіх кадраў. Усё гэта блазумоўна прала на руку буржуазна - кулацкім, пятлюраўскім элемэнтам, палягчаючы ім магчымасьць пралазіць у савецкі апарат, калгасы і г. д.

І тут дзе-ні-дзе была практыка пазбаўленьня нацыянальных меншасьцей права карыстацца роднай мовай. А з боку пасобных кіруючых украінскіх работнікаў узмацнена прапагандавалася шавіністычная ідэя аб абавязковай украінізацыі пасобных раёнаў СССР.

Гэта, вядома, таксама не магло ня праць на руку кулацкім і пятлюраўскім элемэнтам, якія акапаліся ў нова-украінізаваных раёнах па-за межамі УССР і вялі там разбуральную работу.

Клясавы вораг заўзята супраціўляецца пераможнаму будаўніцтву сацыялізму, накіроўваючы свае зброю і супроць ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Задачы партыйных арганізацый, асабліва Украіны, Беларусі, Сярэдняй Азіі, Казакстану і інш. нацыянальных рэспублік і абласьцей, з так сама мясцовага друку—заключаюцца ў тым, каб своячасовым выкрыцьцём новай тактыкі і падкопаў клясавых ворагаў зрываць з іх маску і паказаць масам сапраўднае контр-рэвалюцыйнае аблічча буржуазна-кулацкіх, нацыяналістычных элемэнтаў, ухілістаў і примірэнцаў да іх. Неабходна ўзмацніць практычнае правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі, забясьпечыць вырашэньне кадрамі ўсе вучасткі нацыянальна-культурнага будаўніцтва, шырока разгарнуць інтэрнацыянальнае выхаваньне мас.

Заваюем новыя вышыні нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу культуры народаў Савецкага саюзу.

Вышэй сьцяг пралетарскага інтэрнацыяналізму!

(Перадавак «Правды»).

САКАВІК--РАШАЮЧЫ МЕСЯЦ ПАДРЫХТОЎКІ ДА СЯЎБЫ

З трыбуны раённых зьлётаў калгасьнікаў-ударнікаў

Зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў Менскага раёну

10-га сакавіка ў доме Камасьветы адкрыўся першы раённы зьлёт калгасьнікаў - ударнікаў Менскага раёну. На зьлёт прыбыла 330 дэлегатаў-байцоў за ўмацаваньне калгаснага ладу, лепшых ударнікаў калгасных палёў.

Пад чырвонымі сьцягамі, шматлікімі лёзунгамі, якія заклікаюць па-бальшавіцку сустрэць веснавую сяўбу—ударнікі Менчыны прыбылі на зьлёт. У гонар зьлёту чырвонымі абозамі здано, каля 30 тон збожжа.

Тут-жа ў чырвонай сталіцы адбылася дружная, цёплая сустрэча ўдарнікаў сацыялістычнай прамысловасьці з ударнікамі сацыялістычных палёў.

Адкрываючы зьлёт, сакратар гаркому КП(б)Б тав. Чарнушэвіч вітае дэлегатаў ад імя пралетарыяту чырвонай сталіцы і яго перадавога авангарду—Менскай партарганізацыі.

— 330 дэлегатаў — лепшых байцоў за ўмацаваньне калгаснага ладу, за бальшавіцкую сустрэчу веснавой сяўбы,—гаворыць тав. Чарнушэвіч,—сабраліся сёньня для таго, каб падзяліцца лепшымі вопытамі работы, каб маблізаваць усю масу калгасьнікаў Меншчыны на заваяваньне першага месца ў барацьбе за пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы.

Тав. Чарнушэвіч заклікае дэлегатаў узьняць сьцяг сацыялістычнага спаборніцтва, забясьпечыць вырашэньне цэнтральнай задачы — павышэньне ўраджайнасьці.

Па прапанове дэлегата зьезду тав. Шаўчэнка зьлёт адзінадушна абірае прэзыдыум, у які ўвайшлі члены бюро ЦК і гаркому КП(б)Б, члены прэзыдыуму ЦКК і гарКК, ЦВК, СНК, Гарсавету, Бюро ЦК і ГК ЛКСМБ, прэзыдыуму ЦСПСБ і Гарпрафсавету; ад таварыства старых бальшавікоў—тав. Сьмідовіч, прадстаўнікі рабочых менскіх прадпрыёмстваў; ад калгасьнікаў — Касьцянецкая, Трушкевіч (удзельнікі ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў - ударнікаў), Грыб, Хмялеўская, Максімовіч, Машэк і Сакольчык.

Пад бурныя воплескі ўсёй залі абраны ў ганаровы прэзыдыум т. т. СТАЛІН, МОЛАТАЎ, КАГАНОВІЧ, ВАРАШЫЛАЎ, КАЛІНІН, АРДЖАНІКІДЗЕ, КУЙБЫШАЎ, АНДРЭЕЎ, ТЭЛЬМАН, ЛЕНСКІ, КОРЧЫК і ГІКАЛО.

Т. СЬМІДОВІЧ узнагароджаная ордэнам Леніна за выдатную самаадданую работу ў галіне камуністычнай асьветы работніц і сялянак, удзельніца зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў Менскага р-ну.

З дакладам аб задачах веснавой сяўбы і арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва ў калгасах выступіў сакратар гаркому КП(б)Б тав. Чарнушэвіч.

Зьлёт віталі прадстаўнікі Чырвонай армі, рабочыя Менску і піянэры.

11 сакавіка на ранішнім паседжаньні зьлёту пачаліся спрэчкі па дакладу т. ЧАРНУШЭВІЧА.

Адзін за другім паяўляюцца на трыбуне дэлегаты зьезду (старшыні калгасаў, калгасьнікі, калгасьніцы), рапартуюць аб гатоўнасьці сваіх калгасаў да вясны.

— Калгас «Чырвоны бальшавік» да веснавой сяўбы падрыхтаван,—кажа зьезду ўдарніца-калгасьніца т. ХАРЫТОНЧЫК,—насенны і страхавы фонд засыпалі, ачысьцілі; устанавілі надзейны догляд за насенным матар'ялам; адрамантавалі ўвесь сельска-гаспадарчы інвэнтар; вывезьлі гною 500 вазоў; попелу сабралі 150 вазоў.

— Мы паставілі перад сабой задачу,—кажа далей Харытончык,—узьняць ураджайнасьць на 15 проц. супраць мінулага году. Мы гэта зробім, мы будзем заможнымі калгасьнікамі, бо мажлівасьці на гэта ў нас ёсьць.

Ад калгасу імя Дзяржынскага выступіў ўдзельнік усесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў т. ТРУШКЕВІЧ. Ён падзяліўся са зьлётам сваімі ўраджаньнямі, якія атрымаў у пралетарскай сталіцы СССР.

— Наша краіна — гаворыць тав. Трушкевіч,—першая ў сьвеце наладжвае новае сацыялістычнае жыцьцё. Гэта вельмі кідаецца ў вочы таму, хто пабываў на фабрыках і заводах Масквы.

Слова бярэ ХАРЭЎСКІ В. К., аднаасобнік Кайкаўскага сельсавету Менскага раёну.

— Я, таварышы, аднаасобнік. Гаспадарка мая складаецца з 5 га зямлі, аднаго каня, каровы, 5 душ сям'і. Мне сорамна перад вамі, што я не калгасьнік. Я канчаткова ўпэўніўся, убачыў перавагу калгаснай гаспадаркі перад сваёй аднаасобнай. Сёньня прашу зьезд прыняць мяне ў вашы баявыя рады.

Харэўскі выймае з шытку заяву і падае яе прэзыдыуму. Старшыня прэзыдыуму ўносіць прапанову, каб заяву ХАРЭЎСКАГА перадаць на разгляд у калгас.

З прывітаньнем зьезду выступіў начальнік падыву №-й Беларускай. Ён заверыў зьезд, што Чырвоная армія была і будзе заўсёды на варце сацыялістычных палёў. Ён патрабаваў ад імя дывізіі працаваць па-ўдарнаму, працаваць так, як працуюць байцы РСЧА па аўладаньню вайсковай тэхнікай, па набыцьцю палітычных ведаў.

Ад таварыства старых бальшавікоў, старой бальшавіцкай гвардыі, выступіла т. Сьвідовіч, якая галоўным чынам спынілася на ролі жанчыны ў калгасе.

На гэтым раніцнае пасяджэньне зьезду скончылася.

Зьлёт барацьбітоў за сацыялістычны ўраджай

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

БАБРУЙСК. 10 сакавіка а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканьні новага тэатру адкрыўся раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў Бабруйшчыны. На зьлёт з усіх канцоў раёну зьехалася 400 дэлегатаў, сярод якіх значная частка жанчын-ударніц.

Пасьля абраньня ганаровага прэзыдыуму, у які ўвайшлі ЦК УсеКП(б) ЦК КП(б)Б і абраньня кіруючых органаў, зьлёт прыступіў да дзелавой работы.

З дакладам аб умацаваньні калгасаў і задачах веснавой сяўбы выступіў сакратар РК КП(б)Б т. Ваўковіч. У сваім дакладзе тав. Ваўковіч на канкрэтных прыкладах жыцьця калгасаў раёну завастрыў увагу дэлегатаў на пасіленьне клясавай пільнасьці, рашучай барацьбы з клясавым ворагам і яго агентурай, на узмацненьні аховы насенных і страхавых фондаў, барацьбы за моцны конскі і трактарны парк, працоўную дысцыпліну, падкрэсьліўшы асабліва недапушчальнасьць ігнараваньня аднаасобнікаў.

На вячэрнім паседжаньні 10 сакавіка зьлёт віталі дэлегацыі Лесакамбінату, вайсковых частак і прафарганізацыі раёну.

Зьлётам пасланы прывітальныя тэлеграмы тав. Сталіну, Варашылаву і тав. Гікало.

У адзнаку зьлёту адбылася дэманстрацыя рабочых камбінату. У гонар зьлёту прыбылі чырвоныя абозы, якімі дастаўлена па пункт Закупзбожжа 70 цэнт. збожжа.

Для ўдзелу ў рабоце зьлёту прыбыла дэлегацыя трактарыстаў Бялуцкай МТС, якая ўключыўшыся у цідзёньнік праверкі цягавай і трактарнай сілы, на зьлёце аформіла свае спаборніцтва са Жлобінскай МТС.

У будынку тэатру, дзе адбываецца зьлёт, адкрылася выстаўка дасягненьняў прамысловасьці і сельскай гаспадаркі раёну, тэхнічнага аснашчэньня Чырвонай арміі.

На зьлёце слухаюць даклад тав. ЧАРНУШЭВІЧА.

Пераклічка ударнікаў прамысловасьці з ударнікамі палёў

МАГІЛЁЎ. (Ад нашага карэспандэнта). 9-та сакавіка адкрыўся раённы зьлёт калгасьнікаў-ударнікаў Магілёўшчыны. На зьлёт прыбыла 600 дэлегатаў—лепшых ударнікаў сацыялістычных палёў.

Зьлёт распачаў сваю работу пад знакам бальшавіцкай падрыхтоўкі і правядзеньня веснавой сяўбы.

Перад адкрыцьцем зьлёту адбылася сустрэча ўдарнікаў заводаў, фабрык з ударнікамі палёў. Дэлегаты наведалі шаўковую фабрыку, завод імя Сталіна і іншыя прадпрыемствы, дзе адбыліся лятучыя мітынгі.

Зьлёт віталі шматлікія дэлегацыі заводаў, фабрык і чырвонаармейскіх часьцей.

АДЗІН З ШАСНАЦЦАЦІ

Яшчэ ня было 11 гадзін, як шэфы Папярнянскага сельсавету,—рабочыя скарняжнай фабрыкі і дражджавога заводу «Пралетарыя» з чырвонымі сьцягамі на Даўгінаўскім тракце чакалі дэлегатаў, калгасьнікаў-ударнікаў, пераможцаў сацыялістычных палёў.

Чакалі каля заводу «Пралетарыя». Каб забраць калгасьнікаў-ударнікаў у горад, сюды прыехала ўбраная лёзунгамі і плякатамі поўтаратонка. Тут-жа кожны дэлегат атрымоўвае адказ на пытаньні, якія яго цікавяць.

— Мы да сяўбы гатовы, хоць і сёньня—кажа калгасьнік Іваноўскі.—У нас 59 гаспадарак. Усе мы разьбіты на тры брыгады і чакаем першага заклику вясеньняга сонца.

Іваноўскі выцягнуў з кішэні кавалачкі паперы і пачаў паказваць:

— Думаеце хлушу? Вось яны, нашы перамогі. Яны маё словы падмацуюць.—Разумееце, мы сёньня будзем рапартаваць,—гаворыць стары,—будзем рапартаваць зьезду калгасьнікаў-ударнікаў аб нашых перамогах.

Якія-ж перамогі атрымаў калгас «Пабеда» Папярнянскага сельсавету?

Паперкі, якія прывёз дэлегат, паказваюць; плугоў трэба—28, а ёсьць 37, і ўсе яны ў спраўнасьці. Барон трэба—40 ёсьць—43, адрамантавана—38. Аднапарных калёс трэба 31 штука, ёсьць 31; адрамантавана—23. Рамонт прадоўжаецца. Збруя адрамантавана поўнасьцю.

Вязь. Калі скончылася таварыская сустрэча, матор Горкаўскай аўтамашыны загудзеў. Шофэрам падан сыгнал. І дэлегаты-калгасьнікі разам з рабочымі ўсаджваюцца ехаць у горад.

Віхрам імчыцца Горкаўка да гарсавету. Сёньня заля пасяджэньняў перавторана ў штаб зьлёту калгасьнікаў-ударнікаў. Тут кожная дэлегацыя прыходзіць да свайго століку, рэгіструецца, атрымоўвае нумары у гасьцініцу, талёны на абеды. Тут-жа кожны дэлегат атрымоўвае адказ на пытаньні, якія яго цікавяць.

— Мы да сяўбы гатовы, хоць і сёньня—кажа калгасьнік Іваноўскі.—У нас 59 гаспадарак. Усе мы разьбіты на тры брыгады і чакаем першага заклику вясеньняга сонца.

Іваноўскі выцягнуў з кішэні кавалачкі паперы і пачаў паказваць:

— Думаеце хлушу? Вось яны, нашы перамогі. Яны маё словы падмацуюць.—Разумееце, мы сёньня будзем рапартаваць,—гаворыць стары,—будзем рапартаваць зьезду калгасьнікаў-ударнікаў аб нашых перамогах.

Якія-ж перамогі атрымаў калгас «Пабеда» Папярнянскага сельсавету?

Паперкі, якія прывёз дэлегат, паказваюць; плугоў трэба—28, а ёсьць 37, і ўсе яны ў спраўнасьці. Барон трэба—40 ёсьць—43, адрамантавана—38. Аднапарных калёс трэба 31 штука, ёсьць 31; адрамантавана—23. Рамонт прадоўжаецца. Збруя адрамантавана поўнасьцю.

Як калгасьнікі калгасу «Пабеда» дабіліся гэтых перамог, чаму яму прадастаўлена права на рапарт зьезду? На гэта дэлегат Іваноўскі адказвае:

— Думаеце, лёгка дасталіся нам,—кажа Іваноўскі—гэтыя перамогі? Мы іх дабіліся вядучы жорсткую барацьбу з кулакам, з лодырам, якія парушалі працоўную дысцыпліну. Такіх людзей было ў нас ня мала. І мы ад іх пазбавіліся. А тыя, якія прыйшлі з сумленным жаданьнем будаваць калектыўную гаспадарку, узяліся ударнаму за работу. Мы забясьпечылі грамадзкі кантроль адзін за другім, бо, як казаў наш правадыр тав. Сталін, адзін сумленны калгасьнік адказвае за дзесятак сваіх суседзяў на рабоце.

Так дабіліся «пабедаўцы» сваіх перамог. Расказваючы аб гэтым, калгасьнік Іваноўскі, той самы Іваноўскі, які не адчувае стараецца і заўсёды бадзёры— і за плугам, і на грамадзкай рабоце,—хвалюецца і рад, што сёньня яго, як прадстаўніка лепшага калгасу, будуць слухаць на зьлёце.

Іваноўскі за ўдарную работу два разы прэміяваўся. А быў Іваноўскі два гады таму назад зусім ня тым, якім мы яго бачым сёньня.

— Як толькі ўступіў я ў калгас (гэта было 2 гады таму назад)—на першых парах неяк нязручна ўсё было, цягнула да сваёй уласнасьці; ці раз мучыла мяне, калі другія запрасілі майго каня, ці бралі зброю. Але гэта толькі першыя месяцы. Гэта быў кароткі час хістаньняў. З цягам часу мае погляды, погляды ранейшага адзіноснік, у корані зьмяніліся ў адносінах да разуменьня прыватнай уласнасьці. А зьмяніліся яны таму, што я пераканаўся і пераконан цяпер у магутнасьці і сіле калгаснага ладу. І стары Іваноўскі, стомлены перажываньнямі радасьці, працягваючы гутарку з рабочымі шэфамі, саджаўца да стала і яшчэ раз расьцягнута паўтарае:

— Будзем будаваць бальшавіцкія моцныя калгасы, будаваць разам з вамі, за адно!.

ПУЧЬЯНСКІ.



Чырвоны абоз з Абчацкага сельсавету ў гонар раённага зьлёту ударнікаў-калгасьнікаў.

Кармы на час пасеўнай забраніраваны: сена—800 пудоў, саломы—800 пудоў, цімафееўкі—200 пудоў.

Выканан плян засыпкі насенных і страхавых фондаў: яўса засыпана—672 цнт (100 проц. пляну); пшаніцы яравой—трэба засыпаць 14,5 цнт, засыпана—21 цнт, бульбы па пляну трэба засыпаць 704 цнт, засыпана—810 цнт. Плян па засыпцы насенных і страхавых зерневых фондаў выканан на 103 проц., па бульбе—на 115.

Як калгасьнікі калгасу «Пабеда» да-

Аб разгортваньні масавай работы саветаў па ўздыму ўраджайнасьці

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

Асноўнай задачай правядзеньня вес навой сяўбы ў 1933 годзе зьяўляецца павышэньне ўраджайнасьці і якасьці сельска-гаспадарчай прадукцыі. Гэта абавязвае саветы, сэкцыі саветаў, дэпутацкія групы і кожнага члена савету неадкладна пераключыцца на работу па падрыхтоўцы да сяўбы, разгарнуць шырокую аргмасавую работу на барацьбу за своячасовую і поўную засыпку і ачыстку насеньня, рамонт трактароў, сельска - гаспадарчых машын і інвэнтару, падрыхтоўку цягавай сілы, завоз і скарыстаньне ўгнаеньня, складаньне вытворчых брыгад у калгасах, увядзеньне правільных севазваротаў, аўладаньне агратэхнічнымі ведамі і бязьлітаснае змаганьне супроць кулакоў, падкулачнікаў і іх агентуры, вядучых падрыўную работу, накіраваную на зрыў сяўбы і мерапрыемстваў па ўздыму ўраджайнасьці.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць РВК і сельсаветы ажывіць работу сельска-гаспадарчых вытворчых нарад пры сельсаветах, саўгасах, калгасах, прыцягваючы да работы ў іх спэцыялістаў—аграномаў, настаўнікаў, актыў, абавязкова абгаварваючы на гэтых нарадах усе канкрэтныя мерапрыемствы па ўздыму ўраджайнасьці. Цэнтр цяжару ўсёй масавай работы па ўздыму ўраджайнасьці і правядзеньню сяўбы перанесьці ў вытворчую калгасную брыгаду і вёску.

Безадкладна на пацыраных паседжаньнях сэкцый сельсаветаў, на вытворчых нарадах, у дэпутацкіх групах саўгасаў, калгасаў, вытворчых калгас ных брыгадах, з аграўпаўнаважанымі, з савецкім, калгасным, жаночым актывам прапрацаваць пастановы партыі і ўраду, аб уздыме ўраджайнасьці, зва рот Першага Усесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў і вызначыць канкрэтныя мерапрыемствы (ачыстка і пратручваньне насеньня, раньні сеў, выкарыстаньне сеялак, угнаеньне, якасьць ворыва баранаваньне і т. д.).

2. Для забясьпячэньня штодзённага жывога кіраўніцтва з боку сельсаветаў і іх масавых органаў ходам падрыхтоўкі і правядзеньнем веснавой сяўбы і ажыцьцяўленьнем мерапрыемстваў па ўздыму ўраджайнасьці, абавязаць усе сельсаветы вызначыць правераных на рабоце членаў саветаў і актывістаў і прымацаваць іх да кожнага саўгасу, калгасу, вытворчай калгаснай брыгады і вёскі. Арганізаваць сыгнальныя дэпутацкія пасты, у першую чаргу ў самых небясьпечных участках і наладзіць іх работу па ажыцьцяўленьні агратэхнічных мерапрыемстваў, накіраваных на ўздым ураджайнасьці.

3. Адзначаючы, што тэмпы работы большасьці гарсаветаў не забясьпечваюць выкананьня дырэктыў партыі і ўраду па ўздыму ўраджайнасьці ў прагарадных гаспадарках і сельсаветах гарадзкой мяжы і што гэтыя гарсаветы ня ўлічваюць урокаў ганебных прарываў мінулага году,—абавязаць усе гарсаветы неадкладна праверыць усе мерапрыемствы па ўздыму ўраджайнасьці ў прыгарадных гаспадарках, саўгасах, калгасах, а таксама сярод аднаасобнікаў на тэрыторыі гарсаветаў.

Пераключыць у бліжэйшы-жа час работу сэкцый, дэпутацкіх груп, інстытуту прымацаваных на поўнае выкананьне мерапрыемстваў па ўздыму ўраджайнасьці, мабілізаваць людзей на дапамогу саўгасам, МТС, калгасам і сельсаветам, вызначыўшы ім цьвёрдыя задачы і абавязкі.

Аб прынятых гарсаветамі мерах і формах масавай работы па ўздыму ўраджайнасьці паведаміць праз дзьве дэкады Аргінструктарскі Аддзел Прэзыдыуму ЦВК БССР.

4. У справе барацьбы за ўздым ўраджайнасьці значную ролю павінен адыграць інстытут сельскіх аграўпаўнаважаных.

Прапанаваць РВК і сельсаветам правяць склад аграўпаўнаважаных, ачысьціць іх шэрагі ад кулацка-варожых і бязьдзейных элемэнтаў і правесьці выбары новых аграўпаўнаважаных з ліку лепшых, адданейшых савецкай уладзе рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў-беднякоў і сераднякоў.

Прапанаваць Наркамзему ў дэкадны тэрмін спусьціць у раёны новую інструкцыю аб правах і абавязках аграўпаўнаважаных. РВК, сельсаветам і зямельным органам ужыць канкрэтныя мерапрыемствы па ажыўленьні работы аграўпаўнаважаных у зьвязку з падрыхтоўкай да севу.

Абавязаць Наркамзем і РВК у другой палове сакавіка правесьці раённыя аднадзённыя курсы—зьлёты аграўпаўнаважаных, забясьпечыўшы поўнае абслугоўваньне гэтых курсаў з боку спэцыялістаў сельскай гаспадаркі. Наркамзему ў дэкадны тэрмін спусьціць у раёны падрабязныя паказаньні.

5. Даручыць Наркамзему БССР, ўпаўнаважанаму Наркамсаўгасаў саўгастрэстам, трактарацэнтрам, Белдзяржвыдавецтву і РВК паставіць сталую работу па ўнядрэньню агратэхнічных ведаў у шырокія колы рабочых МТС, саўгасаў, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў, шляхам арганізацыі школ, курсаў і агратэхгурткоў, завочнага навучаньня, выданьня належнай папулярнай літаратуры. Для правядзеньня гутарак на курсах, школах прыцягваць лепшых работнікаў саўгасаў, калгасаў, МТС, усямерна скарыстоўваючы вопыт іх работы ў галіне ўздыму ўраджайнасьці.

6. РВК, гарсаветам і сельсаветам работу раённых і сельскіх дамоў сацкультуры і чырвоных куткоў падпарадкаваць у першую чаргу інтарэсам веснавой сяўбы і ўздыму ўраджайнасьці, наладзіць выпуск насьценных газэт пры сельсаветах, саўгасах, калгасах вытворчых саўгасных і калгасных брыгадах, накіраваўшы ўвагу на папулярызацыю дасягненьняў агранамічнай навукі ў галіне ўздыму ўраджайнасьці і ўвядзеньня правільных севазваротаў, у сув

Аб ходзе рамонту трактароў

Пастанова СНК БССР і ЦК КП(б)Б

1. ЦК КП(б)Б і СНК канстатуюць, што ў ходзе рамонту трактароў няма адзнак пералому і што ёсць яўная пагроза зрыву своячасовага (да 15-га сакавіка) рамонту.

ЦК і СНК тлумачаць гэты нездавальняючы ход рамонту ў першую чаргу адсутнасцю канкрэтнага, апэрацыйнага, уваходзячага ва ўсе дэталі справы, кіраўніцтва як з боку НКЗ (яго трактарных аб'яднанняў), Упаўнаркамсаўгасаў (іх яго трэстаў), так і з боку райкомаў, РВК, дырэктароў і сакратароў ячэек МТМ, МТС і саўгасаў.

Ганебнымі, нявартымі бальшавікоў, зьяўляюцца тэмпы рамонту трактараў і матораў па Гарадзецкай, Горацкай, Клімавіцкай, Камарынскай і Сеньненскай МТМ, на Менскім, Магілёўскім сьпіртаводтрэстах, Гомельскім Малпрамтрэсце і Племсьвінтрэсце, на Бешанковіцкай, Сураскай, Крупскай, Чавускай, Барысаўскай, Жлобінскай, Магілёўскай МТС.

ЦК і СНК лічаць неабходным зьняць з работы з перадачай справы ў ЦККК дырэктара Гарадоцкай МТМ Лялюгу і Цікліўскай МТС Зелянкоўскага.

Адклікаць, як ня справяўшагася з работай і не забясьпечыўшага бальшавіцкіх тэмпаў работы, упаўнаважанага ЦК па Гарадоцкай МТМ т. Даўгапольскага, абвясьціць вымову дырэктарам Бешанковіцкай, Сураскай, Жлобінскай МТС т. т. Агееву, Кавалёву.

Указаць упаўнаважанаму ЦК і СНК па Воршы тав. Чарнышову, што ён да гэтага часу на забясьпечыў пералому ў рабоце Аршанскай МТМ, зав. «Чыр. барацьбіт», Аршанскага сьпіртаводтрэсту і Аршанскага складу Белснабрамонту. Папярэдзіць т. Чарнышова, што калі да 12 сакавіка ня будзе забясьпечана рашучага пералому, ЦК і ЦККК прымуць больш суровыя меры спагнаньня. Папярэдзіць усіх дырэктароў трактарных цэнтраў і саўгасных трэстаў, дырэктароў і сакратароў ячэек МТМ, МТС і саўгасаў, прадпрыемстваў, якія рамантуюць трактары і вырабляюць запчасткі, сакратароў ГК і РК КП(б)Б і ўпаўнаважаных ЦК і СНК, што ЦК і СНК дадуць да 17 сакавіка ацэнку кожнаму з вышэйпаказаных таварышоў пад кутом гледжаньня таго, як яны забясьпечылі сканчэньне рамонту ў тэрмін і што ЦК і СНК будуць зьмяняць няспраўляўшыхся з працай работнікаў, ня гледзячы на асобы.

2. Улічваючы, што ні трактарным цэнтры, ні Белснабрамонт не забясьпечваюць неабходных у даны момант бальшавіцкіх тэмпаў работы, якіць неабходным на перыяд рамонту прымацаваць у якасьці ўпаўнаважаных ЦК і СНК наступных таварышоў: Файнгаўза — да Гародня-бульбянага трактарацэнтру; Сакаленка — да Збожжатрактарацэнтру; Вайновіча — да Ільнатрактарацэнтру; Рохкіна (арэнінструктар ЦК КП(б)Б) — да Белснабрамонту.

Ускласьці пэрсанальную адказнасьць за ход рамонту трактараў па МТС на сакратароў РК, як упаўнаважаных ЦК і СНК. Ускласьці пэрсанальную адказнасьць за чоткую работу складаў: «Саўгасрамонту — на тав. Сьмірнова, Белснабрамонту: Менскага — на тав. Будніка, Аршанскага — тав. Чарнышова, абавязаўшы іх штодзённа правяраць і дапамагаць у рабоце складу.

3. Улічваючы, што найбольш вузкім месцам у ходзе рамонту трактараў зьяўляецца дастаўка запчастак і недахоп бабіту.

а) абавязаць прадпрыемствы штодзённа адгружаць запчасткі і ў тэлеграфных зводках указваць аб наяўнасьці на заводзе неадгружаных запчастак. Забараніць прадпрыемствам адгружаць запчасткі ў адрас складаў Белснабрамонту і саўгасаў;

б) абавязаць склады ўказаных арганізацый занараджваць і адпраўляць на пункты рамонту трактараў грузы, пры складаньні выразны графік работы, якія атрымліваюцца па саюзных разнарадках, не пазьней, як праз 24 гадзіны з моманту атрыманьня грузу;

в) абавязаць дырэктароў прадпрыемстваў не пазьней 48 гадзін са дня апублікаваньня гэтай пастановы паведамляць у Цэнтрапасеўком аб колькасьці наяўнага бабіту Б-1 і волава.

Абавязаць дырэктароў МТС і саўгасаў не пазьней 11 сакавіка тэлеграфна паведамляць у Цэнтрапасеўком аб лішках бабіту, папярэджваючы іх, што ўсякая спроба ўхіленьня ад пасылкі бабіту ў МТМ і прадпрыемствы, у якіх рамантуюцца трактары і мато ры данага саўгасу і МТС, будзе разглядацца, як крымінальная справа;

г) разьвярстаць не пазьней 14 гадзін 8 сакавіка па МТМ і прадпрыемствах, вырабляючых запчасткі, бабіт і волава, выкуленыя згодна тэлеграмы тав. Гікало.

4. У сувязі з тым, што частка запчастак асядае ў МТС і саўгасах, і дырэктары апошніх не пасылаюць на месца рамонту сваіх трактараў належную колькасьць запчастак, прапанаваць РКК-РСІ. пад пэрсанальную адказнасьць старшынь правэрыць гэтыя факты не пазьней 10 сакавіка прыняць надзвычайныя меры да высылкі гэтых запчастак у МТМ і прадпрыемствы, паведаміўшы аб прынятых мерах у Цэнтрапасеўком не пазьней 11 сакавіка.

5. Прапанаваць РК, дырэктарам і ячэйкам МТМ, МТС і саўгасаў неадкладна перабудаваць работу гэтых прадпрыемстваў, увёўшы трохзьменную работу, вылучыўшы вядучыя групы рамонтнікаў, склаўшы выразны графік работы, ліквідаваўшы абязьлічку ў працэсе рамонту трактараў і т. д.

Прапанаваць РК, дырэктарам і ячэйкам МТМ, МТС і саўгасаў прыняць неадкладныя меры да ачыстки іх ад клясава-чужых і шкодніцкіх элементаў.

6. Канстатуючы, што на 5 сакавіка ні НКЗ, ні Упаўнаркамсаўгасаў не даставілі на прадпрыемствы Белмэтальаб'яднаньня ўсіх прызначаных трактараў, прапанаваць тав. Рачыцкаму і Жолудаву не пазьней 12 гадзін 8 сакавіка прадставіць неабходную разнарадку і асабіста прасачыць за своячасовай дастаўкай трактараў на прадпрыемствы.

7. Абавязаць дырэктароў МТС і саўгасаў адгружаць з МТМ і заводаў адрамантаваныя трактары ня больш, як праз 24 гадзіны з моманту прыёму камісіяй і ня больш, як праз два дні са дня сканчэньня рамонту.

8. Абавязаць тав. Амбражунаса і дырэктароў прадпрыемстваў зьвярнуць асаблівую ўвагу на якасьць вырабляемых запчастак. Адначасова ўскласьці пэрсанальную адказнасьць на тав. Рачыцкага за выпрабаваньне і адбалку адрамантаваных трактароў і запчастак.

9. Абавязаць тав. Амбражунаса і дырэктароў прадпрыемстваў фарсаваць выраб тых дэталяў (напрыклад, пільзы), з-за якіх тармозіцца рамонт трактараў.

Старшыня СНК БССР
ГАЛАДЗЕД
Сакратар ЦК КП(б)Б
ШАРАНГОВІЧ

ЗВОДКА

ХОДУ РАМОНТУ ТРАКТАРОЎ ПА БССР на 10 сакавіка 1933 г.

Патрэбна адрамантаваць **2837** трактароў, адрамантавана **1445**, проц. выкананьня **50,9** прырост за дзень складае **1,6** проц.

Па Ленатрактарацэнтру

План рамонту **623** трактары, адрамантавана **334**, што складае **53,6** процантаў.

За апошнія два дні па гэтым трактарацэнтры адрамантавана толькі 17 трактароў. Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што ўся сыстэма, пачынаючы ад кіраўніцтва і канчаючы МТС, ня здолела перабудавацца на-ходу і выправіць памылкі мінулага кіраўніцтва. Так, Бешанковіцкая МТС, з вызначаных да рамонту 29 трактароў на сёвешні дзень адрамантавала толькі 2 (дырэктар Агееў С. Е.); Крупская МТС з 11 трактароў адрамантавала толькі 1 (дырэктар Бобрык). і г. д.

Па Зернятрактарацэнтру

Неабходна адрамантаваць **342** трактары, адрамантавана **236** выкананьне **69** проц.

Дырэктар тав. ДУБОЎСКІ

За апошнія два дні адрамантаваны 31 трактар, прырост на 9,1 проц. Трактарацэнтр павінен напружыць усе свае сілы з тым, каб замацаваць зрыў і дабіцца своячасовага выкананьня плану. Для гэтага перш за ўсё патрэбна падагнаць адстаючыя МТС, як напрыклад: Пухавіцкую, якая выканала план рамонту на 25 проц. (дырэктар Шаблоўскі); Хойніцкую—выкананьне—19,2 проц. (дырэктар Гадлеўскі); Бягомльскую—выкананьне 45 проц. (дырэктар Буйвоў) і г. д.

Па гародня-бульбянаму трактарацэнтру

Патрэбна адрамантаваць **517** трактароў, адрамантавана **323**, што складае **62,5** проц. да пляну.

Дырэктар тав. ГРАБЕНЧЫК

Прырост за апошнія два дні складае 5.8 проц. Адкак, такія тэмпы яўна незадавальняючыя, калі ўлічыць тое становішча, што да тэрміну сканчэньня рамонту астаецца 5 дзён. Асабліва зрываюць рамонт наступныя МТС: Барысаўская, выканаўшая план рамонту на 12 проц. (дырэктар Хініс); Магілёўская—выкананьне 16,7 проц. (дырэктар Банчук Б. А.); Рэчыцкая—выкананьне 37,9 пр. (дырэктар Рашкоў Ю.) і г. д.

Па Наркамсаўгасу

План рамонту **700** трактароў, адрамантавана **302**, або 43,1 проц. да пляну.

Адказны за рамонт тав. БІМБАТ

Сыстэма наркамсаўгасаў па ранейшаму зрывае рамонт. Пры выкананьні пляну на 43,1 проц. прырост за апошнія 2 дні па 5,1 проц. зьяўляецца вынікам апартуністычнага кіраўніцтва, недаацэнкі важнасьці своячасовага прывядзеньня ў баявую гатоўнасьць трактарнага парку.

ЗАЎВАГА: Зводка па 27 МТС складзена згодна даных на 10 сакавіка, а па астатніх узяты папярэднія даныя.

ЗА ГРАНІЦАЙ

ФАШЫСЦКІ ТЭРОР У ГЕРМАНІІ УЗМАЦНЯЕЦЦА

Пагроза па адрасу кампартыі

БЭРЛІН. 10-III. Учора вечорам на нацыянал-сацыялістскім сходзе ў Франкфурце-на-Майне выступіў германскі міністр унутраных спраў Фрык, які ў сваёй прамове заявіў, што «пры адкрыцьці новага рэйстагу 21 сакавіка—для камуністаў там ня будзе месца». Паводле слоў Фрыка яны будуць памешчаны ў канцэнтрацыйных лягерах. Адкак, заявіў Фрык, «павінны зьнікнуць ня толькі камуністы, але і іх чырвоныя саюзнікі з сацыял-дэмакратыі».

Штурмавікі занялі казарму у дэмілітарызаванай зоне

БЭРЛІН. 10-III. Агенцтва «Вольф» перадае: «У сувязі з пашырэньнем заграніцай паведамленьняў аб заняцьці казармаў у Келе на Рэйне нацыянал-сацыялістскімі штурмавікамі, з кам пэтэнтнай крыніцы заяўляюць, што справа ідзе аб часовым прабываньні ў гэтай казарме каля 200 штурмавікоў з вясковых аколіц Келя. Штурмавікі сёньня ўжо вярнуліся дамоў да нармальнай работы.

Увесь гэты інцыдэнт ні меў ніякага ваеннага характару і ня меў ніякіх ваенных мэтаў, але знаходзіўся ў сувязі з унутрыпалітычнымі зьменамі ў Бадэне».

Антысэміцкія дэманстрацыі нац. сацыялістаў

БЭРЛІН. 10-III. Антысэміцкія выступленьні нацыянал-сацыялістаў прадаўжаюцца ў многіх гарадох Германіі. У Бэрліне перад некалькімі ўнівэрмагамі і магазынамі, ямія належаць яўрэям, нацыянал-сацыялісты наладзілі дэманстрацыю, выкрыкваючы хорам: «немцы купляйце ў немцаў», і імкнуліся не дапусьціць пакупшчыкаў у гэтыя магазыны.

Такія дэманстрацыі прайшлі амаль па ўсёй краіне. У некаторых магазыны ўрываліся нацыянал-сацыялісты ў форме з крыкам: «вон яўрэяў». У адзін з унівэрсальных магазынаў была кінута атрутная бомба. Рад магазынаў і унівэрсальных магазынаў былі вымушаны спыніць гандаль.

ГУГЕНБЭРГ.

Паліцыя расстрэльвае камуністаў

БЭРЛІН. 10-III. У Більштэке ля Гамбургу паліцыя быццам імкнулася затрымаць «узброенага камуніста», які пасьля выкрыкаў паліцыі ня спыніўся. Паліцыя спраляла. Уцякаўшы, сьмяротна ранены, памёр у больніцы.

Катаваньне камуністаў у Бэрліне

ЛЕНДАН. 10-III. «Дэйлі Геральд», спасылаючыся на вельмі аўтарытэтныя крыніцы, паведамляе, што ў Бэрліне атрады нацыянал-сацыялістаў арганізуюць аблавы на камуністаў, ня маючы на гэта афіцыйных распараджэньняў.

«Часам,—піша газэта,—яны па-ўтому поваду перадаюць свае ахвяры ў распараджэньне паліцыі. У іншых выпадках цягнуць захопленых у дом у Бэрліне, які пільна ахоўваецца, дае бязьлітасна зьбіваюць іх і падвяргаюць розным іншым агідным карам». У прыватнасьці, нацыянал-сацыялісты прымушаюць свае ахвяры піць рыцыны». У Бэрліне,—піша «Дэйлі Геральд».—маюцца, на крайняй меры, тры такіх дамы катаваньняў, а ў адным з іх, які знаходзіцца на добра вядомай вуліцы, мелі месца зьбіваньні стальнымі прутьцямі. Некаторымі з захопленых людзей зьвязваюць рукі і ногі. Многія, якія потым былі перараны палкі, былі так моцна паранены, што іх зараз-жа памясьцілі ў турэмныя больніцы. Гэтымі днямі 80-90 чал. былі дастаўлены ў адзін з гэтых трох дамоў і бязьлітасна зьбіты.

Польска-германскія адносіны абвастраюцца

„Перастрэлка перад боем"

БЭРЛІН. 10-III. Германскія газэты прадаўжаюць рэзка выказваць па поваду выступленьня Польшчы супроць Данцыгу. Блізкая да ўраду «Берлінер Бёрзэн-Цэйтунг» піша, што Германія «не дапусьціць, каб Данцыг перастаў існаваць, як германскі горад».

«Рэйнішэ Вэстфалішэ Цэйтунг» лічыць, што польская ваенная атрады ў напярэдадні Вэстэрплятэ прадстаўляюць сабою сур'ёзную небясьпеку для спакою на ўсходніх границ і міру ў Эўропе і патрабуюць неадкладнай сатысфакцыі за парушэньне праў з боку Польшчы. Польшчы ў Вэстэрплятэ трэба расцэньваць толькі, як перастрэлку, якая папярэджвае бой».



МОЦНАЕ СУСЬВЕТНАЕ ВАЛЮТАТРАСЕНЬНЕ.

Рузвэльту далі дыктатарскія паўнамоцтвы

ВАШЫНГТОН. 9-III. Спэцыяльная сэсія канґрэсу ў сьпешным парадку разгледзела і прыняла законапраекты аб прадастаўленьні Рузвэльту дыктатарскіх паўнамоцтваў. Прэзыдэнт атрымлівае права кантролю над банкамі, забароны вывазу і накапленьня золата, канфіскацыі золата ў прыватных асоб і выпуску новых грошай без залатога забесьпячэньня.

ВАШЫНГТОН. 10-III. Дзяржаўны дэпартамэнт паведамляе, што ў сувязі з гвалтамі над амэрыканскімі грамадзянамі ў Германіі, ім заяўлен пратэст германскаму ўраду. Германскі ўрад у сваім адказе заявіў, што прыме меры для папярэджаньня падобных выпадкаў у будучым.

Даход ПАШ сакраціўся на 53 процанты

НЬЮ-ЁРК. 9-III. Згодна паведамленьня аценкі статыстычнай арганізацыі «Нэй пэнэл Індэстрыел Конфэрэнс Борд» нацыянальны даход Злучаных Штатаў у 1932 годзе скараціўся прыблізна на 53 проц. у параўнаньні з 1929 годам і склаў толькі 40 млр. долараў.

*

НЬЮ-ЁРК. 10-III. Згодна паведамленьня «Асошыэйтэд Прэс», пагранічная захова ПАЗШ перахапіла самалёты, якія імкнуліся вывезьці ў Мэксыку золата на 250 млн. долараў.

**

НЬЮ-ЁРК. 10-III. Банкаўскі мараторый і эмбарго (забарона) на вываз золата) прадоўжаны на нявызначны час.

Забастоўка 120 тысяч лодзінскіх тэкстыльшчыкаў

ВАРШАВА. 10-III. Забастоўка тэкстыльшчыкаў у Лодзінскім раёне захоплівае ўсё большую і большую колькасьць рабочых. На працягу ўчарашняга дня да бастуючых далучыліся яшчэ 15 тыс. рабочых. Такім чынам у сучасны момант бастуе каля 120 тыс. тэкстыльшчыкаў. У самой Лодзі забастоўка ахапіла 95 проц. ўсіх рабочых. Бастуюць рабочыя 250 тэкстыльных прадпрыемстваў.

Па СССР

Буйнае вынаходніцтва савецкага інжынэра

Інжынэр Наркамсувязі тав. Д. Л. ГАНДЛЕР скансструяваў апарат для звышхуткарасной перадачы па радыё і дроту друкаваных твораў на любую адлегласьць.

Для перадачы «Известий» або «Праўды» у любы пункт СССР і заграніцы з усімі малюнкамі, дыяграмамі і асаблівасьцямі шрыфтоў патрабуецца ня больш 30 мінут. Перадача адной паласы газэты лепшымі ў сьвеце заграничнымі апаратамі «тэлефункен-каролес» займае 6-8 гадзін. Замест 200 літараў у мінуту, якія маюсьмальна перадаюцца апаратам «тэлефункен-каролес», апарат інжынэра Гандлера лёгка можа перадаць у мінуту 15 тыс. слоў.

Для перадачы на адлегласьць існуючым спосабам, газэта разьбіваецца на 76 кадраў у 2 квадратныя дэцымэтры кожны, кадры перадаюцца асобна. На зарадку кожнага кадру патрэбна 5-7 мінут. Апарат інжынэра Гандлера перадае па адлегласьць газэту палкам па канвэеру.

Увесь апарат тав. Гандлера можа быць пабудаваны з савецкіх матар'ялаў на савецкіх заводах. Каштоўнасьць перадачы друкаваных твораў на адлегласьць па спосабу тав. Гандлера ў 12 разоў таней чым перадача існуючымі спосабамі.

Папярэднія падлікі паказваюць, што на перадачу 5 газэт па 23 кіруньках па спосабу тав. Гандлера, у параўнаньні з іншымі спосабамі у год будзе эканомлена ня менш 5 млн рублёў.

Вынаходніцтва тав. Гандлера адобрана цэнтральнай лябараторыі дроставай сувязі Наркамсувязі і хутка будзе выпрабавана ў лябараторных умовах.

Фізкультура і спорт

▲ БЮРО ФІЗКУЛЬТУРЫ ЦСПСБ да 1 Усебеларускага зьезду ўдарнікаў - калгасьнікаў арганізуе на катку «Прафінтэрн» вялізарны фізкультурны карнавал на ільдзе, прысьвечаны падрыхтоўцы да першай вясны другой пяцігодкі.

На ільдзе будзе інсцэнавана барацьба калгаснага актыву проціў кулацкага сабатажу, які зрывае збожжазагатоўкі і падрыхтоўку да сяўбы.

Паказ будзе суправаджацца зачытваньнем вытрымак з прамовы тав. СТАЛІНА аб рабоце на вёсцы, з дакладу тав. КАГАНОВІЧА на 1 Усесаюзным зьезьдзе ударнікаў - калгасьнікаў і звароту Першага Усесаюзнага зьезду калгасьнікаў.

▲ 5 ПЕРАСОВАЧНЫХ ЛЫЖНЫХ БАЗ на 500 пар лыж накіроўвае Менскі Гарадзкі Савет Фізкультуры ў калгасы раёну для дапамогі ў падрыхтоўкі да сяўбы і здачы нормы на значок ГПА па лыжах.

Кіно

▲ ДЛЯ ПРАКТЫЧНАЙ ДАПАМОГІ КАЛГАСАМ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ Віцебскае аддзяленьне Белдзяржкіно накіроўвае ў калгасы раёну тры брыгады. У склад брыгад уваходзіць аграном, вэт доктар, прапагандыст, кіно-мэханік, і брыгадзір рэдакцыі «ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ».

▲ 300 КАМСАМОЛЬЦАЎ мабілізаваны Віцебскім гаркомам камсамолу на барацьбу з сьнегавымі заносамі на чыгуначным вузьле.

КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Каса ад 12 г. дня

Сёньня замежны мастацкі фільм

Тры джыгі

Аргкаміт т ССП БССР Дом Пісьменьніка

12 сакавіка а 7 гадзіне

ТВОРЧЫ ВЕЧАР П. Глебкі.

Паэт выступіць з дакладам на тэму:

„Маё разуменьне паэзіі"

і прачытае свае творы.

УВАХОД ВОЛЬНЫ

Згодна пастановы СНК БССР ад 25-II 1933 г.,

Беларуская будаўнічая кантора пры Белжылсаюзе з аддзяленьнямі—

у Менску, Віцебску, Воршы, Барысаве, Магілеве, Бабруску, Гомелі, Мазыры, Рэчыцы

ЛІКВІДУЕЦЦА

Усе ўстановы, арганізацыі і прыватныя асобы, якія маюць пратэзіі да памянёнай канторы і яе аддзяленьняў, абавязаны ў двухтыдневы тэрмін падаць заявы: па Менску цэнтральнай ліквідакамісіі, а па астатніх гарадох—у мясцовыя ліквідкамісіі пры Гаржылсаюзе.

Цэнтральная ліквідкамісія прымае заявы з 5-III па 20-III 1933 г. пры Белжылсаюзе, Інтэрнацыянальная, 12.

Ліквідком

З 10 сакавіка 1933 г.

ДЫРЭКЦЫЯ МЕНСКАГА ЦЭЦ ЛІКВІДУЕЦЦА

Прэтэнзіі ліквідкомам будуць прымацца да 15 сакавіка 1933 г.

Адрас ліквідкому: Менск, 3-я Лекерта, пляцоўка ЦЭЦ

Ліквідком

Рэдакцыі газ. „Савецкая Беларусь"

ПАТРЭБНЫ МАШЫНІСТКІ,

якія добра ведаюць беларускую мову, на сталую дзённую і вячэрнюю работу

ПАСТАНОВА

Калегіі кіраўніцтва народна-гаспадарчага вучоту БССР № 23 ад 26 лютага 1933 г.

Аб увядзеньні рэгістрацыі будаўнічых работ у органах КНГВ БССР

У выкананьне пастановы СНК БССР за № 211 ад 25 лютага 1933 г. (надрукавана ў газэце «Савецкая Беларусь» № 55 ад 10 сакавіка 1933 году) аб абавязковай рэгістрацыі ў органах Народна-Гаспадарчага Вучоту ўсіх будаўнічых работ Кіраўніцтва Народна-Гаспадарчага Вучоту БССР пастанаўляе:

1. Увесьці з 1 студзеня 1933 г. бягучую рэгістрацыю будаўнічых работ у органах Кіраўніцтва Народна-Гаспадарчага Вучоту БССР пры Р.В.К. і гарсаветах.

Тэрмін пачатку рэгістрацыі устанавіць 25 сакавіка 1933 г.

2. Усе дзяржаўныя ўстановы і прадпрыемствы незалежна ад іх падпадраздаванасьці, а таксама каапэрацыйныя і іншыя грамадзкія арганізацыі, прыватныя юрыдычныя асобы і паасобныя грамадзяне абавязаны рэгістраваць у органах Народна-Гаспадарчага Вучоту ўсе правадзімыя імі гаспадарчым спосабам і будаўнічымі арганізацыямі работы па ўзьвядзеньню новых будынкаў і пабудоў і па рэканструкцыі і пашырэньню існуючых будынкаў і пабудоў.

3. Рэгістрацыя будаўнічых работ складаецца з паведамленьня органам Народна-Гаспадарчага Вучоту вестак: а) аб становішчы няскончанага ў канцы году будаўніцтва, б) аб пачатку будаўнічых работ, в) аб сканчэньні будаўніцтва, г) аб спыненьні будаўніцтва, д) аб пераводзе аб'екту будаўніцтва на кансэрвацыю, е) аб зьмене забудоўшчыка, ж) аб зносе будынку або пабудоў.

4. Рэгістрацыі падлягаюць наступныя будаўнічыя работы, якія праводзяцца ў адносінах будынкаў і пабудоў:

а) Новае будаўніцтва.
б) надбудова будынкаў.
в) прыбудова.
г) перабудова.
д) адбудаваньне разбуранага і нягоднага для эксплёатацыі будынку або пабудовы і
е) капітальны рамонт, калі ён вядзе да павялічэньня карыснай плошчы будынкаў або разьмеру пабудовы. Капітальны рамонт чугуначнага палатна, шасэйных і грунтавых дарог і лінейнай пабудовы сувязі рэгіструецца незалежна ад зьмены разьмеру.

5. Усе дзяржаўныя ўстановы і прадпрыемствы, каапэрацыйныя і іншыя грамадзкія арганізацыі і прыватныя юрыдычныя асобы рэгіструюць будаўнічыя работы, якія праводзяцца паўсюды ў гарадох, пасёлках гарадзкога тыпу, сельскіх мясцовасьцях і па-за населенымі пунктамі; паасобныя грамадзяне рэгіструюць будаўнічыя работы, якія праводзяцца толькі ў гарадох і пасёлках гарадзкога тыпу.

6. Рэгістрацыі падлягаюць усе віды будаўніцтва прамысловае, сельска гаспадарчае, транспартнае, камунальнае і г. д. прычым рэгіструюцца толькі работы на чыстаму будаўніцтву.

7. Рэгістрацыя будаўнічых работ у межах кожнага раёну робіцца ў раённай інспэктуры Народна-Гаспадарчага Вучоту, якая знаходзіцца пры райвыканкомах; у Менску, Віцебску і Гомелю будаўніцтва павінна рэгістравацца ў гарадзкіх інспэктурах Народна-Гаспадарчага Вучоту пры гарсаветах.

8. Бягучая рэгістрацыя будаўнічых работ робіцца у наступныя тэрміны:

а) Рэгістрацыя пачатку работ робіцца на працягу 5 дзён спачатку работы.

б) Рэгістрацыя сканчэньня будаўнічай работы павінна рабіцца на працягу 15 дзён пасьля сканчэньня аб'екту.

в) Рэгістрацыя пачатку зносу аб'екту (будынку або пабудовы), а таксама ўсякага роду паведамленьні аб рэгістраваным аб'екце, як: аб спыненьні будаўнічай работы, аб пераводзе аб'екту на кансэрвацыю, аб дэкансэрвацыі, аб зьмене забудоўшчыка, аб заканчэньні зносу аб'екта і г. д. робіцца на працягу 5 дзён.

Рэгістрацыя будаўніцтва, якое пераходзіць на 1933 г., робіцца на працягу 2 дзкад ад 25 сакавіка да 15 красавіка.

Усе паведамленьні аб рэгістраваным аб'екце, як: аб кансэрвацыі, дэкансэрвацыі, зьмене забудоўшчыка, заканчэньні будаўнічых работ і іншым робіцца ў той-жа інспэктуры Нар. Гас. Вучоту, дзе аб'ект быў зарэгістраван першапачаткова.

УВАГА: 1. Пачаткам будаўніцтва трэба лічыць дату пачатку землязавоз матар'ялаў за пачатак будаўніцтва ня лічыцца.
ных работ. Падрыхтоўка вучастку, як: ачыстка, плянаваньне

УВАГА: 2. Сканчэньнем работ трэба лічыць поўнае выкананьне будаўнічых работ па чыстаму будаўніцтву, намечаных па каштарысу ня лічачы гарантыйных работ і дату афіцыйнай прыёмкі і складаньня канчатковых разьлікаў.

9. Рэгістрацыйныя формы і паказаньні па іх заканчэньню атрымліваюцца ў раённай або гарадзкой інспэктуры Народна-Гаспадарчага Вучоту ў залежнасьці ад таго, дзе даны аб'ект павінен быць зарэгістраван (у раённай або гарадзкой інспэктуры).

Забудоўшчыкі або ўласьнікі маёмасьці, прызначанай да зносу, павінны загадзя атрымліваць формы рэгістрацыі і ўсё паказаньні па іх запаўненьню, каб рэгістрацыя аб'екту была зроблена з захаваньнем тэрмінаў паказаных у п. 8.

10. Абавязак рэгістрацыі ляжыць на забудоўшчыку або яго прадстаўніку на будаўніцтве незалежна ад спосабу правядзеньня будаўнічых работ (падрадны, гаспадарчы, зьмешаны). Калі будаўнічыя работы вытвараюцца падрадным спосабам і на будаўніцтве няма сталага прадстаўніка заказчыка, дык забудоўшчык па дагаворанасьці з падрадчыкам можа ускласьці абавязак рэгістрацыі на генэральнага падрадчыка. У гэтым выпадку забудоўшчык павінен у абавязковым парадку наглядаць за выкананьнем падрадчыкам усіх правіл рэгістрацыі і нясе адказнасьць за выкананьне яе ў вызначаныя тэрміны.

11. Усім ведамствам і арганізацыям належыць выдаць загад па сваіх ведамствах аб абавязковай рэгістрацыі будаўнічых работ у органах Народна-Гаспадарчага Вучоту пры РВК і Гарсаветах.

НАЧ. КІРАЎНІЦТВА НАР. ГАС. ВУЧОТУ БССР СТРАКОЎСКІ.

Гр. ЧАРНЫШОЎ Мацьвей Трахімавіч, які пажодзіць з гор. Касімава, Маскоўскай вобласьці і зараз жыве ў гор. Віцебску, ЗЬМЯНЯЕ сваё прозьвішча і імя Чарнышоў Мацьвей на КУБАНСКІ Уладзімер

Асобы, якія маюць пратэсты, а віны заявіць у Віцебскі гарзагс

Нарсуд Брагінскага раёну на падставе прысуду ад 6-X 1932 году за нядбайныя адносіны да сваіх службовых абавязкаў, абвяшчае ГРАМАДЗКАЕ ГАНЬБАВАНЬНЕ гр м-ка Брагіна КАРАНЧУКУ Зьмітру Мацьвееву.

Нарсуд Брагінскага раёну на падставе прысуду ад 8-IX 1932 году за нядбайныя адносіны да сваіх службовых абавязкаў, абвяшчае ГРАМАДЗКАЕ ГАНЬБАВАНЬНЕ гр. м-ка Брагіна Алесю Пятрову НЕСЬЦЯРОК

Нарсуд Брагінскага раёну на падставе прысуду ад 28-XI 1932 году за нядбайныя адносіны да сваіх службовых абавязкаў, абвяшчае ГРАМАДЗКАЕ ГАНЬБАВАНЬНЕ гр. вёскі Тяклінаў, Брагінскага раёну, Алесю Адамаву КУЛІЦКАМУ

Гр. РАК Сяргей Міхайлавіч, які паходзіць з гор. Лепеля, ЗЬМЯНЯЕ сваё прозьвішча РАК на РАВІЧ. Асобы, якія маюць пратэсты, павінны заявіць у Лепельскі гарзагс

Нарсуд Брагінскага раёну на падставе прысуду ад 15-IX 1932 г. за нядбайныя адносіны да сваіх службовых абавязкаў абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр вёскі Дуброўнае, Астрагандаўскага сельсавету, Брагінскага раёну, ДАНЧЭНКА Мік Амельканову.

ЗГУБЛЕНА КРУГЛАЯ ПЯЧАТКА з надпісам: «Вячэрняя рабочая школа № 5». Лічыць страціўшую моц

Камсамольскі білет, выд. Дрысенскім РК КСМ на імя Воравава Л. Л., квіт № 6176.

Членскі білет, выд. на імя Воравава Л. Х., квіт № 177.

Партбілет, членскі білет саюзу скурнікаў, пашпарт, выд. Менск. мілп. і вайсковы білет, выд. Менскім ваенкамат. на імя Кальтмана Р. Я.

Пасьведч. асобы, выд. ф-кай «Камунарка» на імя Шульман С. А., квіт 211

Членск білет, выдан на імя Карагін М С., кв. 213

Мотрычны выпіс, выд. Менскім загсам на імя Райхлён Р. К., квіт 197

Вайсков білет, выданы Рачыцкім ваенкаматам на імя Рачкоўскага І. А., квіт 198.

Членскі білет, выданы саюзам саўгандальслужач. ве імя Рачкоўскага І. А., квіт 199

Стаўзе пасьведч., выд Белвлодаб'яднаньнем на імя Рачкоўскага І. А., кв. № 200.

Мотрычны выпіс, выд. Менскім загсам на імя Жук І. П., квіт 201

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Менскага Гарадзкога Савету ад 9 III 1933 году

Аб становішчы з вывазкай гною з гораду ў прыгарадныя гаспадаркі

Адзначаючы, што становішча з вывазкай гною з гораду ў прыгарадныя гаспадаркі знаходзіцца пад пагрозай зрыву, Прэзыдыум Менскага Гарадзкога Савету пастанаўляе:

1. Адмяніць раней выданыя Зямельным Аддзелам нарады па вывазцы гною з гораду ў прыгарадныя гаспадаркі, зацьвердзіць наступны парадак прымаваньня асобных устаноў, арганізацый, вайсковых частак і інш. месц:

а) да саўгасу „Зялёны Луг": Клінічны Гарадок, Дом Друку, друкарню Сталіна, стадовую-рэстаран, жакт № 26, ЗРК „Металіст", завод „Камунар" і вайсковую частку;

б) да саўгасу „Новы Сьвет": ф-ку «Беларуская», друкарню «Зьвязда», Жакт № 27 і вайсковую частку;

в) да саўгасу „Кастрычнік": ф-ку «Кастрычнік», «Саюзхлеб», Жакт № 58 і вайсковую частку;

г) да саўгасу «Варашылава»: завод «Ударнік», завод імя «Варашылава», Віленскі рынак, Санстацыю, дом «Прыхільніка дзяцей», Лямпавую фабрыку, завод „Чырвоны Хімік" Белгандаль, Жакт № 60 і АБВШ;

д) да саўгасу «Бальшавік»: «Саюзтранс», завод «Бальшавік», транспарт асабовы Гаржылсаюзу, арцель «Победа», Жакт № 59, млын „Адраджэньне" (Кальварыя), УМТ і вайсковыя часткі;

е) да саўгасу «Чырвоны Маяк»: Банна-Прольны трэст, Белупіль, абутковую майстэрню гарсавету, аптэкакіраўніцтва, багатэрнае, бэтонны завод, дэзынфекцыйную станцыю, абутковую фабрыку і сталоўку, ЗРК абутнікаў, Дэпр, Выдаканатрэст, ФЗВ КІМ, арцель абутнікаў, жакт № 29 і АБВШ (частку гною);

ж) на саўгасу «Чырвоны Транспартнік»: транспарт МЦРК, сьпіртзавод, Скурсындыкат, Дом грудного дзіцяці, арцель „Упэрад", Шпалерную фабрыку, сьвіналадкормачныя пункты МЦРК, Сураскі рынак, шчотачную фабрыку, базу Менплодагародтрэсту, шклозавод і вайсковую частку.

в) да саўгасу „Саншны": ТЭЦ, ТПО, бойню, адкормачны пункт № 2 (50 прол.), Універсытэцкі Гарадок, транспарт асабозу чыгункі, жакт № 53, Пастэраўскі інстытут (Маськоская вул.), малочны завод, фабрыку «Камунарка», асабоз Камгасу і вайсковую частку;

і) да саўгасу імя Лекерта: жакт № 39 і вайсковыя часткі;

к) да калёніі Навінкі (Гарадраву)—вайсковую частку.

2. Абавязаць дырэктароў саўгасаў і загадчыкаў гаспадарак усё налічча гною з прымацаваных месц вывезьці до 15 сакавіка г. г.

Невыкананьне гэтага з паказаны тэрмін будзе разглядацца, як сьвядомы зрыў мерапрыемстваў партыі і ўраду на падвяцьцю ўраджайнасьці.

3.